**І.М.ШАРУХА**
*МДУ імя А.А.Куляшова*

# ВОПЫТ КАНСТРУЯВАННЯ ПАЧАТКОВЫХ ПРЫРОДАЗНАЎЧА – ГЕАГРАФІЧНЫХ ПРАДМЕТАЎ У РАСІІ І БЕЛАРУСІ

У Расіі на сённяшні дзень існуе шэраг варыянтаў па азнаямленню з прыродазнаўча-геаграфічным матэрыялам у пачатковай школе. Дзяржаўны адукацыйны кампанент "Навакольны свет" вывучаецца ў I-IV класах. У I-II класах (па 1 г.) вывучаецца курс "Навакольны свет", а ў III-IV (па 2 г.) выкладаецца ў варыянтах: інтэграваным і аналітычным (прадметы "Прыродазнаўства" і "Уводзіны ў гісторыю").

Для **традыцыйнай пачатковай школы** цэласна распрацавана для ўсіх чатырох класаў **пяць варыятыўных курсаў** (сістэм): "Зялёны дом" (аўтар – А. Плешакоў), "Прырода і людзі" (З. Кляпініна), "Навакольны свет" (Н. Вінаградава, Г. Іўчанкава, І. Патапаў), "Свет і чалавек" (А. Вахрушаў, А. Раўціан), "Навакольны свет" (В. Паглазава, В. Шыліна).

Інтэграваны курс **"Зялёны дом" А.А.Плешакова** (I-V класы). Інтэграваны прадмет "Свет вакол нас" (I клас, тэмы "Прырода", "Жыццё горада і вёскі", "Здароўе і небяспека", "Зносіны", "Падарожжы"). У II-III класах вывучаецца "Прыродазнаўства".

Сістэма **"Прырода і людзі"** (З. Кляпініна; I-II класы курс "Я і свет навокал", III-IV –"Прыродазнаўства"). У I класе тэмы: "Здароўе", "Прырода вакол нас", у II-м – сезонныя змены, у III – геаграфічныя і анатамічныя звесткі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Трэці варыянт – “Навакольны свет”** (з 1992г.). Тэмы I класа: “Ты – першакласнік”, “Тваё здароўе”, “Мы і рэчы”, “Прырода вакол нас”, “Наша краіна”; у II – “Чалавек і яго здароўе”, “Што знаходзіцца вакол нас”, “Мае сябры – дарослыя і дзеці”, “Чалавек і прырода”, “Наша краіна”; у III – “Што знаходзіцца вакол нас”, “Чалавек і яго здароўе”, “Чалавек сярод людзей”; у IV – “Як чалавек пераўтварае свет”, “Прырода нашай краіны”, “Чалавек”.

Сістэма пабудавана на ідэях агульнага погляду на навакольны сацыяльны і прыродны асяродак і месца чалавека ў ім, на пазітыўным эгацэнтрызме, краязнаўчым, прыродаахоўным, радзімазнаўчым, агульназемлязнаўчым і экалагічным прынцыпах (паралельна – курс “Я і свет навокал”).

**Чацвёрты варыянт - “Свет і чалавек” (“Окружающий нас мир”)** планаваў тэмы: I клас – “Свет вачыма чалавека”; II-III – “Свет і чалавек” (“Зямля”, “Часткі свету”, “Жывыя насельнікі планеты”); IV –“Чалавек”. Зараз курс вывучаецца ў I-II класах.

**Пяты варыянт – “Навакольны свет”** (I-IV) інтэгруе асновы прыродазнаўчых і гуманітарных ведаў. З улікам сенсітыўных перыядаў развіцця дзяцей, у мэтах падтрымкі і развіцця пазнавальнага інтарэсу і матывацыі атрымання ведаў аб свеце і сваім арганізме ўключаны тэмы: “Чалавек і яго творчасць”, “Прыгажосць”, “Сіметрыя ў навакольным свеце”, “Перыядычныя змяненні ў прыродзе”, “Зямля” і т.п. Акцэнтуецца ўвага на дапасаваннях, суадносінах паміж жывой і нежывой прыродай (на прыкладзе кругаваротаў), на іх збалансаванасці.

Акрамя гэтых варыянтаў выкладаюцца гістарычныя і гісторыка-геаграфічныя прадметы: **“Мая Айчына”** (I-IV клас), **“Уводзіны ў гісторыю”**, **“Наша Радзіма і сучасны свет”**.

У пачатковых школах, што займаюцца **па сістэме Л. Занкова**, у кампаненце **“Навакольны свет”** вывучаюцца курсы **“Мы і навакольны свет”**, **“Я і навакольны свет”**, **“Твая Расія”**.

Акрамя гэтага прапануецца вывучэнне геаграфіі. У 1996 г. у РФЦ імя Л. Занкова падрыхтаваны падручнікі з геаграфічным зместам. Напрыклад, курс “Геаграфія – 2” уключае раздзелы: “Наш агульны дом”, “Арыентаванне ў прасторы і часе”, “Геліяцэнтрычная сістэма свету”, “Сем кліматаў”.

У школах, што займаюцца **па сістэме Д. Эльконіна –В. Давыдава,** вывучаюцца курсы “Навакольны свет”, “Прыродазнаўства”.

Для школ Расійскай Федэрацыі распрацаваны і цэлы шэраг іншых прадметаў: “Чалавек і навакольнае асяроддзе” (I-II класы), “Навакольны свет” з з мадэлі “Экалогія і дыялектыка” (эстэтычнае і комплекснае ўспрыманне рэчаіснасці, вызначэнне месца чалавека ў прыродзе), “Свет падарожжаў”

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(спартыўна-гульнёвы-турысцка-географа-краязнаўчы курс), "Я і мой свет" (этыка-прававы курс з прыродазнаўчымі тэмамі), "Сонца – наша зорка" і інш.

Усе пералічаныя курсы маюць скразныя накірункі: экалагічны, краязнаўчы, радзімазнаўчы, агульназемлязнаўчы і інш., утрымліваюць асновы ведаў з валеалогіі і бяспекі жыццядзейнасці.

На Беларусі таксама вядомы намаганні па стварэнню альтэрнатыўных верагоднасных мадэляў развіцця пачатковай прыродазнаўча-геаграфічнай адукацыі.

Канструяванне вучэбных прадметаў мадэлі праводзілася аўтарам "па схеме С. Сідора":

фармулёўка мэт – аналіз зместу навукі – адбор матэрыялу –дыдактычная перапрацоўка матэрыялу – змястоўны блок навучальнай дысцыпліны – вучэбны прадмет.

Аўтар прапаноўвае інтэгравана-дыферэнцыяваныя курсы "Светазнаўства" (1-2 (0-1) класы, закладвае падмурак ведаў аб свеце), "Прыродазнаўства" (3(2) класы; класічны прыродазнаўчы матэрыял), "Радзімазнаўства" (4(3) клас) [1].

*Літаратура*

1. Шаруха І.М. Аўтарская праграма прыродазнаўча-геаграфічных курсаў // Пач.школа. –1999. – № 11. – С.30-32; № 12. – С.14-16; 2000. – № 2. – С.27-29.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова